**Капітан** Мішута Радзівон Сяргеевіч // Памяць. Пастаўскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад. К. І. Козак, А. І. Кузняцоў ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Белта, 2001. — С. 526—527.

## КАПІТАН МІШУТА РАДЗІВОН СЯРГЕЕВІЧ

Нарадзіўся ў 1953 г. у в. Вінаграды Шаркаўшчынскага раёна. Закончыў сярэднюю школу № 2 у г. Паставы, працаваў кінамеханікам у калгасе імя Мічурына Пастаўскага раёна. Пасля заканчэння ваеннага вучылішча ў г. Адэса служыў на Далёкім Усходзе, на Курыльскіх астравах, у Прыбалтыцы. У 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан. Капітан Р. С. Мішута загінуў 11.2.1984 г. Пахаваны ў в. Волахі Пастаўскага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...У час адной з аперацый на баявой машыне выйшла са строю рацыя. Трэба было некаму выбірацца з-пад брані. Павінен гэта, канешне, зрабіць падначалены. Але капітан Мішута сказаў: «Я сам». Выйшаў на такую негасцінную для нашых хлопцаў афганскую зямлю. І разрыўная куля трапіла ў шыю...